Вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця галіны за студзень-верасень 2026 года разглядалі сёння ў Мінсувязі

Па выніках 9 месяцаў 2026 года ў цэлым арганізацыі галіны паказваюць станоўчую дынаміку паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця па кірунку, які курыруе Мінсувязі.

4,6 працэнта ў структуры ВУП краіны склала ўдзельная вага секцыі «Інфармацыя і сувязь». Станоўчая дынаміка росту даходаў ад дзейнасці ў галіне тэлекамунікацый захоўваецца ўжо не першы справаздачны перыяд.

Рэзюмуючы працу прадпрыемстваў сістэмы Мінсувязі за 9 месяцаў, міністр адзначыў, што сітуацыя ў галіне пазітыўная, у цэлым па Мінсувязі прадпрыемствы галіны працуюць у адпаведнасці з бізнес-планамі. «Аднак расслабляцца не варта: год трэба закрыць годна і рыхтавацца ўжо да паказчыкаў наступнага года».

Як падкрэсліў Кірыл Залескі, і на 2027 год перад галіной пастаўлены важныя задачы. Гэта і развіццё новых лічбавых сэрвісаў, гэта і нарошчванне інфраструктуры для нацыянальнага контуру штучнага інтэлекту, гэта і развіццё мабільнай сувязі ў тых параметрах, якія замацаваны сёння нарматыўна-прававымі актамі, развіццё кліенцкага сэрвісу. У ліку прыярытэтных застаецца задача, пастаўленая Кіраўніком дзяржавы, па вырашэнню пытанняў сувязі ў малых і ў аддаленых населеных пунктах.

Source URL:
https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/vyniki-sacyyalna-ekanamichnaga-razviccya-galiny-za-studzen-verasen-2026-goda-razglyadali-syonnya-u